# НОЧ ВАЙНЫ

Добра помняць нашы дзяды:
У тую страшную ноч усё гарэла
Калі грымнулі стрэлы вайны,
Калі вораг пайшоў на нас смела.

Калі плакалі дзеткі малыя,
Бо баяліся ліхай ночы,
Калі дзяўчаты зусім маладыя
Ішлі пад кулі заплюшчыўшы вочы.

Калі  цяжка стагналі ад ранаў
Маладыя байцы ў медсанбаце.
Калі сына чакала на ганку,
Выціраючы слёзы маці.

Калі сэрца кавалак удавы
Адарвала вайна разам з мужам,
За плячыма малыя сыны,
Але гора ёй трэба адужыць.

Маладое дзяўчо так галосіць,
Бо па любаму душачка ные.
Нібы іржавай іголкай хтосьці
Зашывае раны жывыя.

Добра помняць дзяды нашы тое,
І хоць хутка прамчацца гады,
Раны час паступова загоіць,
Але ж памяць пакіне сляды.

Ну, дык што ж, мы жывём цяпер мірна,
Дзякуй Богу няма бяды,
Але войнаў страшныя гімны
Ў нашых сэрцах пакінуць сляды.

*Алена Шнаркевіч*